*А.В.Шаціла*

# ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ СТАРАЖЫТНАГА МІФА Ў МАСТАЦТВЕ САЛОМАПЛЯЦЕННЯ

Узнікненне і развіццё мастацтва саломапляцення ў Беларусі адлюстроўвае светапогляд народа як сістэму калектыўных традыцый у адносінах да рэальнасці. Мастацтва саломапляцення са знікненнем земляробчых рытуалаў і абрадаў, у якіх яно з'явілася, працягвае сваё існаванне. Зараз яго развіццё характарызуецца новымі тэмамі, новымі тэхналогіямі, але пры гэтым яно захоўвае свае сутнасныя ўнутраныя асаблівасці як часткі нацыянальнай культуры. Традыцыйнасць назіраецца ў выкарыстанні ідэй, вобразаў, сюжэтаў, якія ўзніклі ў старажытнасці і захаваліся ў народнай свядомасці да нашага часу. Аналіз вытокаў, шляхоў развіцця, функцыянавання і трансфармацыі вобразна-сімвалічнай сістэмы народнай культуры, у якой захавалася шмат архаічных рыс перыяду індаеўрапейскай агульнасці, – неабходны крок у разуменні народнага мастацтва.

У народным мастацтве, як старажытным, так і сучасным, шмат міфалагічных вобразаў. Міф і міфічная рэальнасць – аснова абрадаў і рытуалаў. Паміж міфамі і рытуаламі існуе нешта накшталт “адваротнай сувязі”, якая забяспечвае стабільнасць сістэмы [4, с. 170]. А праз уяўныя, вонкавыя формы міфалагічная рэчаіснасць набывае сваё новае жыццё ў народным дэкаратыўна-прыкладным мастацтве.

У аграрных міфалогіях, акрамя касмаганічных міфаў, існавалі міфы каляндарныя, якія сімвалічна паўтаралі прыродныя цыклы. У наш час цяжка аднавіць абрадавы цыкл, нягледзячы на тое, што некаторыя абрады захаваліся ў народным асяроддзі да нашых часоў, злучаныя з хрысціянскай міфалогіяй. Ад архаічнай аграрнай міфалогіі засталіся толькі песні або пэўная ўмоўнасць рытуальнага дзеяння. Асабліва складана вызначэнне часу ўзнікнення абрадаў, таму што ў розных мясцовасцях яны носяць розныя назвы і прыпадаюць на розныя святы. Назвы і дакладныя тэрміны знаходзяцца па-за межамі нашых ведаў, яны могуць вызначацца толькі гіпатэтычна [5, с. 61]. Земляробчыя культы славян па сутнасці знаходзяцца на стадыі магіі і анімізму, нягледзячы на тое, што перасталі развівацца ў гэтым кірунку з прыняццем хрысціянства [5, с. 72]. Каляндарныя рытуалы

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

садзейнічаюць цыклічнай інтэрпрэтацыі часу. Для аграрнага рытуальнага комплексу характэрны матывы ўваскрашэння, адраджэння, вяртання, у рэальнасці – феномен адраджэння ў прыродзе [4, с. 219].

Старажытная аграрная абраднасць, якая ўвасобілася ў мастацтве саломапляцення, у пэўнай частцы інтэрпрэтуе старажытны міф пра бога навальніцы і яго праціўніка. Старажытны міф з'яўляецца тут мадэлюючай сістэмай светапогляднага кірунку. У гэтым кантэксце саломапляценне мела толькі магічны, рытуальны характар. У дадзеным выпадку нас цікавіць міф як парадак, структура, мадэль для мастацтва, як сістэма ўяўленняў, якая знайшла своеасаблівае адлюстраванне.

Пры даследаванні зместу міфа пра бога навальніцы і яго праціўніка на індаеўрапейскім матэрыяле высветлілася наступнае. У старажытнаславянскай мове карані -вел- і -вол- (аналагічна ў беларускай -вял- і -вал-) аднолькавыя [6, с. 90]. Беларускія даныя, семантычна блізкія з літоўскімі і ўсходнеславянскімі, а таксама індаеўрапейскімі захавалі гэты міф на розных ступенях яго развіцця. Сустракаецца ён у некаторых формах рытуалаў і абрадаў у асноўным у выглядзе рэшткаў земляробчага культу. Вось толькі галоўныя высновы шматлікіх даследаванняў пра Вялеса, якія маюць значнасць:

– у сістэме бінарных апазіцый супрацьстаўляецца Перуну [1, с. 3];

– лічыўся богам памерлых, смерці, а таксама ўладаром зямных і падземных вод;

– быў звязаны з аграрным культам;

– атаясамліваўся з ідэямі ўрадлівасці, адраджэння, жыццёвай моцы зямлі;

– лічыўся богам багацця, клятвы, дамовы, міру, а таксама роду (зыходзячы з архаізмаў, дзе корань *-вел-*, *-вол-* выкарыстоўваецца для абазначэння ўлады ці тэрытарыяльных адзінак [2, с. 51]);

– семантычна звязаны з вешчунамі (абрадамі, магіяй);

– у сваім старажытным увасабленні ўспрымаўся як чорт;

– увасабленнем Вялеса былі мядзведзь, воўк, бык [1, с. 3];

– імя Вялеса звязана з валасамі, воўнай [1, с. 6; 2, с. 49].

– пасля прыняцця хрысціянства яго функцыі перайшлі да св.Уласія, св.Мікалая Мірлікійскага (даследаванні Б.А.Успенскага) ці да св.Георгія.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Трэба падкрэсліць своеасаблівую дыягнастычную ролю імён багоў як кропкі сутыкнення моўнага (больш зменлівага) і надмоўнага ўзроўняў, якія ўзыходзяць да старажытнай міфалагічнай мадэлі, менш змененай яшчэ і таму, што забылася [2, с. 78]. У народным абрадзе паказальныя суадносіны Вялеса і Іллі і звычай завіваць бароды Вялесу, Іллі, або "жытняму дзеду". Вялесава (Валосава) барада здаўна была вядома ўсім славянскім народам. У значнай ступені гэты культ захаваўся ў беларусаў і ўкраінцаў (да 30-х гг. XX ст.) і ў розных рэгіёнах Беларусі меў розныя назвы і праявы. Назва "Вялесава барада" вядома толькі ўсходнім славянам, у заходніх і паўднёвых яе няма. У югаславаў захавалася назва "божая барада", але імя бога забылася [7, с. 425]. Сербы і чарнагорцы называлі яе "божай барадой", у рускіх яна мела назвы "барада Іллі-прарока", "Ніколе на бараду", "барада Фролам–Лаўрам", "Хрысту на бародку" [3, с. 166–167]. Такая недарэчнасць у назвах характэрна для старажытнаміфалагічных матываў, калі блытаюцца імёны багоў, іх функцыі і ролі.

Злучэнне мёртвага, зжатага поля з Вялесавай барадой і апошнім снапом у пэўнай меры тлумачыць сувязь Вялеса са светам продкаў, якія знаходзяцца ў зямлі і дапамагаюць яе ўрадлівасці [7, с. 425]. У міфе назіраецца ўзаемасувязь смерці і жыцця, сувязь паміж смерцю і новым нараджэннем. Апошні сноп, апошнія каласы на полі ўвогуле мелі і сакральны сэнс адначасова і ахвяры, і гарантыі новага ўраджаю.

Такім чынам, інтэрпрэтацыя старажытных міфалагічных уяўленняў праз абрадавасць і сімволіку саломы спарадзілі шматлікія формы выкарыстання гэтага матэрыялу і далейшае развіццё мастацтва саломапляцення, яго вобразнасці, тэхнік і прыёмаў. Зараз мастацтва саломапляцення – адметнасць нацыянальнай беларускай культуры.

---


1. *Зайкоўскі Э.М.* Месца Вялеса ў дахрысціянскім светапоглядзе насельніцтва Беларусі. – Мн., 1998. – 15 с.

2. *Иванов В.В., Топоров В.Н.* К проблеме достоверности поздних вторичных источников в связи с исследованиями в области мифологии (данные о Велесе в традициях Северной Руси и вопросы критики письменных текстов) // Труды по знаковым системам, 6: Сб. ст. в честь М.М.Бахтина (к 75-летию со дня рождения). – Тарту, 1973. – С. 46–82.


БИБЛИОТЕКА БГУКИ

*3. Лозка А.* Беларускі народны каляндар. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мн.: Полымя, 2002. – 240 с.

*4. Мелетинский Е.М.* Поэтика мифа. – М.: Наука, 1976. – 408 с.

*5. Никольский М.М.* История русской церкви. – Мн.: Беларусь, 1990. – 657 с.

*6. Попович М.В.* Мировоззрение древних славян. – Киев: Наукова думка, 1985. – 167 с.

*7. Рыбаков Б.А.* Язычество древних славян. – 2-е изд. – М.: Наука, 1994. – 608 с.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ